**ПАДПЕ́ЧНІК**, Падпечка, дух, які жыве ў хаце пад печкай. Уяўлялі яго ў выглядзе пачварнай жывёліны, калматага, з чырвонай галавою і вогненнымі бліскучымі вачыма; замест пярэдніх лап у яго чалавечыя рукі, а замест задніх — чалавечыя ногі, толькі з доўгімі кіпцюрамі. Верылі, што П. удзень ніколі не выходзіць з-пад печкі. Часам, калі нікога не бывае дома, акрамя дзяцей, ён высоўвае сваю галаву і, паварочваючы ёю і бліскаючы вачыма, палохае дзяцей, якія раздурэлі ў адсутнасць бацькоў. Аднак ён нічога кепскага ім не робіць. Затое ўночы П. не дае спакою кепскім, грэшным, несумленным людзям і наогул тым, хто зрабіў нейкае злачынства. П. мроіцца ім, з'яўляючыся перад імі ў жахлівых абліччах, выраблячы розныя страшныя жэсты, бегаючы па сцяне, лётаючы над іх галовамі і казычучы сваёю калматай галавою іх твары. Пра П. ведаюць амаль ва ўсёй Беларусі, толькі пад рознымі назвамі. У народзе можна было пачуць: «Падпечнік налякаў — бачна штосьць спсутаваў», «Каб табе Падпечка прысніўся».

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1852. Лит. прибавление № 3.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ